УДК 373.2

# АСАБЛІВАСЦІ ПРАЦЫ НАСТАЎНІКА-ДЭФЕКТОЛАГА З СЕМ'ЯМІ ДЗЯЦЕЙ ВА ЎМОВАХ ПУНКТА КАРЭКЦЫЙНА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ДАПАМОГІ ДЗІЦЯЧАГА САДА

# CHARACTERISTICS OF THE TEACHER-DEFECTOLOGY WORK WITH THE FAMILIES OF CHILDREN IN THE CONDITIONS OF THE CORRECTIVE PEDAGOGICAL ASSISTANCE POINT OF THE KINDERGARTEN

**І.І. Захарэвіч**

**I. Zakharevich**

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Трабская сярэдняя школа Іўеўскага раёна",**

**Гродзенская вобласць, Рэспубліка Беларусь**

Анатацыя. У артыкуле звяртаецца ўвага на некаторыя прычыны,якія аказваюць адмоўны ўплыў на эфектыўнасць карэкцыйнай дапамогі і ўскладняюць працэс узаемадзеяння настаўнікаў-дэфектолагаў з бацькамі, ў сем'ях якіх выхоўваюцца дзеці з парушэннямі маўлення.Аўтар гаворыць аб неабходнасці развіцця рэабілітацыйнай культуры сем'яў для паляпшэння адукацыйна-карэкцыйнай работы, арыентаванай на пераадоленне другасных парушэнняў і задавальненне асаблівых адукацыйных патрэб дзяцей з парушэннямі маўлення.

Abstract. The article draws attention to some reasons that have a negative impact on the effectiveness of correctional assistance and complicate the process of interaction between special education teachers and parents whose families have children with speech disorders.The author talks about the need to develop a rehabilitative culture of families to improve educational-corrective work focused on overcoming secondary disorders and meeting the special educational needs of children with speech disorders.

Ключавыя словы: парушэнне маўлення; настаўнік-дэфектолаг; сям'я; рэабілітацыйная культура.

Key words: speech disorder; special education teacher; family; rehabilitation culture

Ва ўмовах дзіцячага сада для настаўніка-дэфектолага пункта карэкцыйнай дапамогі адной з важных задач назаўсёды застанецца псіхолага-педагагічная падтрымка і дапамога сем'ям, дзеці з якіх наведваюць тут заняткі. Такая праца патрабуе партнёрскіх узаемаадносін з бацькамі кожнага дзіцяці, а гэта ў сваю чаргу будзе не толькі адной з важнейшых умоў іх станоўчага ўключэння ў карэкцыйна-адукацыйную работу са сваімі дзецьмі, але таксама і спосабам яе паляпшэння.

Звернем сваю ўвагу на некаторыя пытанні, якія ўзнікаюць ў час псіхолага-педагагічным суправаджэння сям'і, якая выхоўвае дзіця старэйшага дашкольнага ўзросту з парушэннямі маўлення таму, што ў гэтай справе, як вядома, ўзнікаюць і шматлікія пытанні.

Адказы на многія з іх можна сустрэць у працах В.І. Селіверстава, Т.Б. Філічавай, Г.У. Чыркінай, А.У. Бачынай, Г.А. Волкавай, А.М. Масцюковай і інш.

Гэтыя навукоўцы прыйшлі да высновы аб тым, што, спланаваная праца з сям'ёй, стане той галоўнай кропкай усебаковага развіцця дзіцяці, авалодання ім сацыяльнымі кампетэнцыямі, ўзбагачэння жыццёвай практыкі, адаптацыі і інтэграцыі ў грамадства. З. Мацейчык, разглядаючы выхаваўчы патэнцыял сям'і,абгрунтаваў сваё меркаванне аб тым,што яна выступае ў якасці першай сацыяльнай супольнасці,ў якой пачынаюць закладвацца асабістыя якасці ў старэйшага дашкольніка і малодшага школьніка. Навуковец указаў на значную ролю бацькоў у сацыяльным і культурным развіцці іх дзяцей [4]. Дадзеная думка, як паказвае практыка, не траціць сваёй актуальнасці і ў адносінах да сям’і, якая выхоўвае дзеця старэйшага дашкольнага ўзросту з парушэннямі маўлення. Такая сям’я адчувае, як сведчаць нашы назіранні, значнае запатрабаванне ў псіхолага-педагагічнай дапамозе з боку спецыялістаў дзіцячага сада, ўключаючы ў тым ліку і настаўніка-дэфектолага.

Не варта недаацэньваць, як сведчаць нашы назіранні, ролю сям'і ў пытаннях пераадолення другасных парушэнняў, якія сустракаюцца ў дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту з паталогіяй мовы. Аднак для вызначэння асаблівасцяў працы з бацькамі гэтых дзяцей мэтазгодна, як паказала практыка, ўлічваць і тыя праблемныя сітуацыі, якія могуць узнікаць у ходзе працы над ёй.

Звернем ўвагу на некаторыя праблемныя пытанні, якія сустракаюцца ў практыцы карэкцыйна-адукацыйнай работы імі, а таксама на некаторых прычынах, якія, як паказвае практыка, значна ўскладняюць узаемадзеянне паміж настаўнікамі-дэфектолагамі і бацькамі іх выхаванцаў.

Адной з прычын, якія адмоўна спрыяюць паспяховаму аказанню карэкцыйнай дапамогі дзіцяці, з’яўляецца адсутнасць у бацькоў падрыхтаванасці да свайго ўдзелу ў такой дапамозе. Практыка паказвае, што шэраг сем'яў валодае нізкім або недастатковым узроўнем рэабілітацыйнай культуры, якая паўстае ў выглядзе комплексу навыкаў і здольнасцяў, якімі забяспечваецца іх пісьменнасць у псіхолага-педагагічным, лячэбным, і іншых планах [3].

Вельмі часта, як сведчаць нашы назіранні, бацькі паведамляюць аб тым, што не маюць магчымасці правесці заняткі ва ўмовах сям'і таму, што ў дзіцяці няма жадання ўспрымаць іх у якасці педагогаў. Таму адной з галоўных задач настаўніка-дэфектолага з'яўляецца навучанне бацькоў станоўчаму ўзаемадзеянню са сваім дзіцем пры падрыхтоўцы да правядзення з ім заняткаў. Рашэнню гэтай задачы садзейнічае не толькі іх прысутнасць, але і непасрэдны ўдзел у іх. Як было адзначана А.У. Бачынай, настаўніку варта максімальна выкарыстоўваць усе магчымыя рэсурсы, каб садзейнічаць павышэнню педагагічнай

кампетэнтнасці і культуры бацькоў у пытаннях, якія тычацца развіцця ў дзяцей з парушэннямі маўлення навыкаў зносін, узбагачэння іх сацыяльна-камунікатыўных практык з дапамогай спецыяльных метадаў і прыёмаў карэкцыйна-педагагічнага ўздзеяння [1].

Пачынаючы сумесную дзейнасць з дзіцем і настаўнікамі-дэфектолагамі, бацькі паступова з іх дапамогай вучацца стымуляцыі вербальнай актыўнасці ў свайго дзіцяці, карэкцыі яго маўленчых парушэнняў за кошт спецыяльных метадычных прыёмаў і сродкаў. Набытую практыку яны выкарыстоўваюць пры арганізацыі працы ў хатніх умовах, не замяшчаючы педагога, не спрабуючы браць на сябе яго функцыі, а працягваючы пачатую ім працу, выступаючы для свайго дзіцяці ў якасці зацікаўленага партнёра па гульні, прадуктыўнай дзейнасці.

Яшчэ адной з важных прычын, якія адмоўна ўплываюць на станоўчую рэалізацыю карэкцыйна-адукацыйнай работы і пазітыўнаму ўзаемадзеянню настаўнікаў-дэфектолагаў з сем'ямі выхаванцаў, з'яўляецца, як паказвае практыка, адсутнасць у бацькоў разумення мэтазгоднасці рэалізацыі таго ці іншага кампанента карэкцыйнага занятку, выкарыстання спецыялістам шэрагу метадычных прыёмаў і сродкаў карэкцыйнага ўздзеяння.У прыватнасці некаторыя бацькі выказваюць здзіўленне наконт уключэння ў структуру занятку дыхальных практыкаванняў, артыкуляцыйнай і пальчыкавай гімнастыкі і г. д. Прычынай гэтага, як і ў папярэднім разгледжаным выпадку, з'яўляецца недастатковы ўзровень развіцця рэабілітацыйнай культуры сям'і,ў тым ліку адсутнасць псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці ў пытаннях аказання лагапедычнай дапамогі дзіцяці з улікам яго ўзросту, структуры парушэння, асаблівых адукацыйных патрэбаў [2].

Разумеючы, што мова іх дзіцяці незразумелая для навакольных людзей, некаторыя бацькі адчуваюць пасля некалькіх праведзеных карэкцыйных заняткаў роспач. Яны не вераць у свой поспех. Аднак, як было адзначана Г.У. Чыркінай, бацькам варта дапамагчы прыйсці да ўсведамлення таго, што пры своечасовым аказанні карэкцыйнай дапамогі ў большасці выпадкаў атрымоўваецца стварыць такія ўмовы, за кошт якіх забяспечваецца паўнавартаснае фізічнае і псіхічнае развіццё дзіцяці з маўленчай паталогіяй [5].

Адпаведна, настаўніку-дэфектолагу варта пазнаёміць сям'ю з магчымымі варыянтамі навучання для дзіцяці, растлумачыць магчымасць выбару найболей дапушчальнага, спрагназаваць і растлумачыць вынікі, якія могуць быць дасягнуты ў бліжэйшай будучыне, агучыць бацькам іх ролю ў аказанні карэкцыйнай дапамогі, а таксама забяспечваць бесперапыннае і пераважна персаніфікаванае суправаджэнне сям'і, дапамагаючы ў вырашэнні праблемных для яе пытанняў, якія маюць адукацыйна-рэабілітацыйны кантэкст. Дарэчы прадаставіць сям'і магчымую мадэль развіцця іх дзіцяці цяпер і ў будучыне ў двух напрамках – пры рэалізацыі сістэматычнай карэкцыйнай працы і ў выпадку яе адсутнасці.

Для гэтай мэты варта выкарыстоўваць сайт навучальнай установы, каб мець магчымасць адказаць на тыя пытанні, якія ўзніклі ў бацькоў выхаванцаў пунктаў карэкцыйна-педагагічнай дапамогі. Карысна, як паказала практыка, настаўніку-дэфектолагу, па магчымасці, выкарыстоўваць у гэтай справе і асабістую электронную пошту і вайбер. Варта адзначыць тое, што мы звярнулі сваю ўвагу толькі на некаторыя прычыны, якія ўскладняюць працэс рэалізацыі карэкцыйна-адукацыйнай работы, да асобных актуальных пытанняў, з якімі сустракаюцца настаўнікі-дэфектолагі ў сваёй дзейнасці. Праблемнае поле, ў якім даводзіцца працаваць спецыялісту дадзенага профіля, вядома, значна большае і шырэйшае. Аднак для павышэння якасці карэкцыйнай дапамогі на адно з галоўных месцаў выходзіць неабходнасць стварэння ўмоў з мэтай развіцця рэабілітацыйнай культуры сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту з парушэннямі маўлення. Гэта, па нашаму меркаванню, значна дазволіць палепшыць карэкцыйна-адукацыйную працу, арыентаваць яе на пераадоленне ў дзіцяці другасных парушэнняў і задавальненне яго індывідуальных адукацыйных запатрабаванняў.

*Спіс выкарыстанай літаратуры*


1. Бачина, О. В. Взаимодействие логопеда и семьи ребёнка с недостатками речи / О. В. Бачина. – М. : Сфера, 2009. – 180 с.
2. Викжанович, С. Н. Медико-педагогическая навигация и формирование реабилитационной культуры семей, воспитывающих детей с проблемами в здоровье / С. Н. Викжанович, О. Ю. Синевич Т. Ю. Четверикова // Мать и дитя в Кузбассе. – 2019. – № 4. – С. 56–61.
3. Викжанович, С. Н. Показатели реабилитационной культуры семьи, воспитывающей ребёнка со специальными образовательными потребностями / С. Н. Викжанович, Т. Ю. Четверикова // Научный потенциал. – 2019. – № 4. – С. 28–30.
4. Матейчик, З. Родители и дети / З. Матейчик. – М. : Просвещение, 1992.–320 с.
5. Чиркина, Г. В. Роль семьи в коррекции врожденных нарушений развития у детей / Г. В. Чиркина // Альманах института коррекционной педагогики РАО. – 2004. – № 8. – С. 5–8.